УДК 37.01: 37.035.6(476)(091)«15»

**М. М. Шчэрбін**
Асістэнт, кафедра гісторыі і МВГ,
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

# УЗБАГАЧЭННЕ ЗМЕСТУ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XVI ст. ПАД УПЛЫВАМ РЭНЕСАНСНА-РЭФАРМАЦЫЙНЫХ ІДЭЙ

*Артыкул прысвечаны даследаванню тэндэнцый развіцця зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XVI ст. на падставе эвалюцыі якасных характарыстык асобы ў адносінах да Радзімы-зямлі, Радзімы-народу і Радзімы-краіны. Паказана рэфармаванне зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў кантэксце талерантна-гуманістычных і прававых каштоўнасцей, вызначана сувязь змястоўнага напаўнення выхавання патрыёта і грамадзяніна з нацыянальна-светапогляднымі і сацыякультурнымі працэсамі фарміравання беларускай народнасці. Устаноўлена значнасць Рэнесансу і Рэфармацыі ў актывізацыі педагагічнай думкі Беларусі XVI ст., абнаўленні зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання прагрэсіўнымі педагагічнымі ідэямі.*

*Ключавыя словы: змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання, Радзіма-зямля, Радзіма-народ, Радзіма-краіна, грамадзянска-патрыятычныя якасці, патрыёт, грамадзянін, Рэнесанс, Рэфармацыя.*

## Уводзіны

Рэнесансна-рэфармацыйныя ідэі садзейнічалі актуалізацыі на беларускіх землях пытанняў фарміравання моладзі, адданай новым формам дзяржаўна-прававога і грамадскага развіцця краіны. Талерантна-гуманістычныя і прававыя каштоўнасці Рэнесансу і Рэфармацыі абумовілі актывізацыю духоўнага жыцця грамадства, выступілі станоўчым імпульсам для перагляду зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Побач з гэтым ва ўмовах этнічнай ідэнтыфікацыі беларускага этнасу запатрабаванасць выхавання патрыёта і грамадзяніна з'яўлялася важным аспектам нацыянальна-свядомаснага самавызначэння народа. Гэта дэтэрмінавала эвалюцыю грамадзянска-патрыятычных якасцей у адносінах да Радзімы-зямлі, Радзімы-народу і Радзімы-краіны ў змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна XVI ст.

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Грамадзянска-патрыятычныя якасці ў адносінах да **Радзімы-зямлі** ва ўмовах акрэсленых пераўтварэнняў трансфармуюцца, перарастаюць межы "роднага куточка" і пашыраюцца да дзяржавы, атаясамліваюцца з канкрэтнай культурна-рэлігійнай, а пазней і этнадзяржаўнай прасторай. У такіх умовах выключнае месца сярод грамадзянска-патрыятычных якасцей займала **этнічная ідэнтыфікацыя**, якая праявілася ў суаднясенні сябе з пэўнай тэрыторыяй, народам, краінай. Гэта садзейнічала паглыбленню сутнаснага напаўнення грамадзянска-патрыятычных якасцей, абумовіла асэнсаванне агульнасці на падставе адзінства этнічных прыкмет.

Адным з першых прыхільнасць да зямлі, дзе нарадзіўся, выказаў Ф. Скарына. Першадрукар, атаясамліваючы сябе з канкрэтным горадам *("сын с Полацька")*, народам *("аз русин")* і мовай *("словенскы язык")*, вылучыў у якасці вядучых грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей Радзіму і асаблівасці народа [1, 29]. Як дрэва не можа існаваць без трывалага кораня, так і індывід павінен абапірацца ў "пазнанні самога сябе" на свае вытокі – агульнасць светаўспрымання, культурна-рэлігійнае адзінства, этнічныя перавагі [1, 29]. Такая пераемнасць разглядалася мысліцелем падмуркам этнічнай ідэнтыфікацыі асобы, фарміравання трывалых грамадзянска-патрыятычных якасцей.

Важнае значэнне сярод грамадзянска-патрыятычных якасцей, накіраваных на Радзіму-зямлю, мела **захаванне гістарычнай памяці**. Дадзеная якасць разглядалася асветнікамі XVI ст.

© Шчэрбін М. М., 2017

МГПУ им. И.П. Шамякина

падставай трывалага развіцця сваёй зямлі, а прыцягненне да вытокаў атаясамлівалася з канкрэтнай зямлёй, надавала ўстойлівы характар асобаснаму развіццю.

М. Гусоўскі звяртаецца да гістарычных традыцый яднання чалавека з прыродай, услаўляе шматлікія багацці і здабыткі сваёй зямлі. Аўтар з гонарам падкрэслівае, што, нягледзечы на выпрабаванні, дзякуючы пераемнасці, народ захаваў самабытнасць сваёй зямлі, уласныя рысы: *“...лад алфавіту наш прашчур для ўласнай карысці // Ў грэкаў пазычыў і гукі мясцовых гаворак // Зладзіўшы з ім… застаўся сабою”* [2, 123]. Гістарычная памяць, паводле меркавання мысліцеля, з’яўляецца асновай выхавання чалавека, натхняе яго на служэнне сваёй зямлі.

Прызнанне ў любові да сваёй зямлі выказаў Ф. Скарына: *“...понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя, птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная бороняхть ульев своих, – тако же и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають”* [1, 27]. Для першадрукара натуральная любоў да свайго краю выступае абавязковай якасцю годнага чалавека, менавіта дзякуючы пачуццю Радзімы, лічыў Ф. Скарына, чалавек здольны захаваць сябе як прадстаўнік пэўнага этнасу.

Распаўсюджванне гуманістычных ідэй на беларускіх землях адбывалася ў “спалучэнні з традыцыйнымі праваслаўнымі дамінантамі беларускай культуры”, якія трансфармаваліся ў “хрысціянскі гуманізм” [3, 102]. Гэта спрыяла развіццю маральнай скіраванасці зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання як асновы фарміравання гуманістычна-арыентаваных нацыянальных пачуццяў. У такіх умовах адну з галоўных роляў у змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна адыгрывала **чалавекалюбства**. Сутнасць этычных поглядаў гуманістаў вызначаў хрысціянскі пастулат, які заклікаў *“...то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных всех”* [1, 22].

Прыярытэт чалавекалюбства выказваў Ф. Скарына. *“Да совършен будеть человъек божий и на всяко дъло добро уготован”*, – сцвярджаў мысліцель, для якога асабістая бездакорнасць была звязана з імкненнем да агульнага дабра [1, 30]. Па прычыне таго, што *“... тако каждый хрестианин, свое имея дарование, к посполитого доброго розмножению да уделяеть, наиболей любовь ко всих да соблудаеть, еже ест совершена над все иные дарования, без нея же ничто проспешно ест”*, – быў перакананы гуманіст [1, 40]. Пры гэтым чалавекалюбства мела ў асветніка яскрава выражаную грамадзянска-патрыятычную скіраванасць, што пацвярджае яго інтэрпрэтацыя з пункту гледжання грамадскай значнасці для канкрэтнай зямлі і народу.

На думку М. Гусоўскага, на любові да людзей павінна трымацца ідэя агульнага міру. Паэт асуджаў *“братазабойствы, грызню, міжусобныя войны”*, што вялі да разбурэнняў і галечы [2, 142]. Словамі са Святога пісання гуманіст настаўляў ажыццяўляць любую справу *“праз любоў к чалавеку”* [2, 144]. Скіраванасцю да згоды, чалавечнасцю і любоўю павінны характарызавацца думкі і справы тых, каму неабыякавы лёс роднай зямлі, лічыў паэт.

Любоў паміж людзьмі як грамадзянска-патрыятычную якасць адзначаў М. Літвін. Мысліцель усхваляў звычаі татараў, што кіруюцца *“умеренностью и воздержанием, и все они живут без излишеств”*, а галоўнае *“превосходят нас любовью к ближнему”* нават да рабоў [4, 158]. Ён лічыў добрымі традыцыі іўдзеяў, якія *“не допускают, чтобы кто-то из народа их погиб от бедности – такая любовь процветает среди них”* [4, 161]. Асветнік імкнуўся ініцыяваць выпраўленне заганаў з дапамогай самаўдасканалення на падставе любові і павагі паміж людзьмі.

Уключэнне беларускіх земель у агульнаеўрапейскія працэсы прывяло да распаўсюджвання погляду на чалавека як актыўнага, думаючага, дзеючага не толькі з мэтай асабістага поспеху, а з пазіцый дабра і справядлівасці, што знайшло адлюстраванне ў эвалюцыі грамадзянска-патрыятычных якасцей да **Радзімы-народу** ў XVI ст. Па перакананні Л. Сапегі, *“все, что не соответствует миру и общественной пользе, может смело рассматриваться как преступление”* [5, 274].

Гуманістычныя ідэі, падтрыманыя моцнымі хрысціянскімі традыцыямі, паўплывалі на запатрабаванасць **сацыяльнай справядлівасці** як важнай грамадзянска-патрыятычнай якасці, сутнаснае тлумачэнне якой мела пэўныя адрозненні ў грамадска-педагагічнай думцы XVI ст.

Погляды Ф. Скарыны характарызаваліся хрысціянскай самаадданасцю і дабрачыннасцю. Адсюль мір і грамадская згода, што будуюцца на прынцыпах *“прироженого закону”*, які *“...написан ест в серци единого кажного человъка”*, з’яўляюцца найлепшым увасабленнем *“братолюбия”*, – быў упэўнены першадрукар [1, 21]. Па гэтай прычыне і адносіны паміж людзьмі павінен вызначаць маральны закон, сумленнасць і справядлівасць, так як *“незгода бо и*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*найбольшие царства разрушаеть”,* – лічыў асветнік [1, 39]. Адпаведна на справядлівасці і павінна трымацца “ўсеагульная згода”, якая выступала важнай умовай існавання поліканфесійнага грамадства ВКЛ.

Талерантную прыроду сацыяльнай справядлівасці адстойваў С. Будны. Гуманіст заклікаў сачыць, *“чтобы люди бедные и сироты не терпели от нищеты и не умирали под забором от голода и холода”* [6, 220]. Мысліцель быў перакананы, што галоўнымі якасцямі чалавека выступаюць *“богобоязненность, справедливость, правдивость и милосердие”,* якія з’яўляюцца гарантам развіцця народу і краіны [6, 220]. Значнасць панавання згоды С. Будны тлумачыў усеагульнай карысцю, накіраванасцю сваіх учынкаў *“не к своей пользе и удовольствию, а к благу..., к удовлетворению нужд граждан земель своих”* [6, 222]. Асветнік падкрэсліваў выхаваўчы патэнцыял сацыяльнай справядлівасці як асобаснай якасці, а таму адводзіў ёй важнае месца ў змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна.

Справядлівасць як “самую цудоўную з усіх дабрачыннасцей” вызначаў А. Волан [7, 290]. Яе сутнасць філосафам тлумачылася як дапамога тым, каму патрэбна, каб *“никто не терпел вреда”* [7, 290]. Мысліцель падкрэсліваў, што *“счастье одних не должно строиться на несчастьи других”* [7, 289]. А. Волан імкнуўся садзейнічаць распаўсюджванню прававых адносін паміж людзьмі, не выключаючы пры гэтым неабходнасць захавання *“прадпісаных ад Бога пэўных норм паводзін”* [хрест., с. 280]. У сувязі з тым, што *“маральныя заганы,* – быў упэўнены мысліцель, – *прычына цяжкіх бядотаў многіх дзяржаў”* [7, 289]. З гэтай нагоды выхаванню справядлівасці, на думку філосафа, трэба надаць асаблівую ўвагу ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Побач з імкненнем да справядлівасці, накіраванасць грамадзянска-патрыятычных адносін на Радзіму-народ адрознівалася ў XVI ст. **неабыякавасцю да лёсу свайго народу.** Згодна з перакананнямі мысліцеляў гэтага часу, першае месца ў жыцці чалавека павінен займаць грамадскі абавязак – *“...не только бо сами по сабе нарожаемся на съвет, а больше для службы божей и посполитого доброго”,* – адзначалі асветнікі [1, 33]. Грамадская накіраванасць чалавечых спраў на агульнае дабро выступала лейтматывам служэння асобы, займала ключавое месца ў змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна.

Прадмовы Ф. Скарыны да Бібліі прасякнуты ідэямі “блага” для свайго народа, імкненнем далучэння яго да агульначалавечых каштоўнасцей. Асветнік скіроўваў свае намаганні дзеля людзей, *“к пожитку и ко размножению добрых обычаев”* [1, 29]. У першадрукара клопат пра лёс свайго народа вызначаўся асветніцтвам людзей, тлумачэннем хрысціянскіх норм, добрымі справамі для падтрымання міру ў грамадстве. Усё гэтыя рысы, паводле Ф. Скарыны, з’яўляюцца важнымі прыкметамі маральнага жыцця, крыніцай самавыхавання і фарміравання актыўнай грамадскай пазіцыі асобы як неад’емных грамадзянска-патрыятычных якасцей.

Жаданне праслявіць сваю Айчыну – *“край... – дзівосны прыстанак загадак і цудаў”* – адрознівае “Песню пра зубра” М. Гусоўскага [2, 130]. Асветнік паэтызуе прыгажосць роднай прыроды, велічнасць краю, мужнасць і шчырасць яго жыхароў, паказвае сябе адданым сынам сваёй Радзімы. М. Гусоўскі імкнуўся звярнуць увагу і на правільнае экалагічнае выхаванне асобы як важную складаючую зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Увагай да лёсу свайго народа адрозніваліся перакананні В. Цяпінскага, занепакоенага тым, што бачыў *“... в таком зацном руском...учоном народе, езыка сваего славнаго занедбане, а просто взгарду”* [8, 234]. Менавіта з шанаваннем уласных каштоўнасцей як найгалоўнейшых дамінант выхавання мысліцель звязваў будучыню народа, яго паспяховае развіццё сярод іншых народаў. Адной з галоўных умоў фарміравання моладзі, прыдатнай да служэння народу і краіне, В. Цяпінскі лічыў далучанасць да лёсу Радзімы.

Пад уплывам этнічных працэсаў адбываецца актуалізацыя важнай грамадзянска-патрыятычнай якасці асобы – **каштоўнаснага стаўлення да сваёй мовы і культуры.** На працягу XVI ст. каштоўнаснае стаўленне да роднай мовы і культуры атрымала запатрабаванасць і на дзяржаўным, і на грамадска-асветніцкім узроўнях.

Па-першае, старабеларуская мова мела дзяржаўны статус у ВКЛ, што адкрывала шырокія магчымасці для яе развіцця, падкрэслівала асаблівую значнасць як прадмета гонару для народа. Менавіта дзякуючы існаванню ўласнай мовы і тэрыторыі дзяржаўным летапісаннем ВКЛ “абгрунтоўвалася права на самастойнае развіццё і роўнае становішча сярод іншых народаў” [9, 26]. Канцлер Л. Сапега, падкрэсліваючы выключную ролю вяршэнства закону ў грамадстве, адзначаў, што асабліва сорамна не ведаць тых правоў, якія *“не чужим каким языком, но своим собственным права записанные имеем”* [5, 272].

МГПУ им. И.П. Шамякина

Па-другое, беларускімі гуманістамі падкрэслівалася адукацыйна-выхаваўчая функцыя мовы, яе найгалоўнейшая роля ў асветніцтве народа, дзякуючы з'яўленню ўласнай літаратуры. Гэта з'яўлялася сведчаннем прызнання важнага значэння роднай мовы і культуры як дамінанты зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Прыхільнаць да нацыянальных каштоўнасцей склала адметную рысу грамадска-педагагічнай думкі Беларусі XVI ст. Пры гэтым, "у прагрэсіўна настроеных колах праваслаўнага грамадства ВКЛ імкненне захаваць "рускую мову", традыцыйную духоўнасць, рэлігію спалучалася з неабходнасцю далучэння да перадавой заходнееўрапейскай культуры" [9, 49–50].

Развіццё грамадзянска-патрыятычных адносін, арыентаваных на захаванне інтарэсаў сваёй Бацькаўшчыны, вылучае скіраванасць грамадзянска-патрытяычных якасцей на **Радзіму-краіну**. Адзначаныя якасці ў XVI ст. зведалі значны ўплыў, акрамя рэнесансна-рэфармацыйных ідэй, працэсаў дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ, у развіцці якіх фарміраванню грамадзянска-патрыятычнай прыхільнасці дзяржаве адводзілася вядучая роля. Важнай якасцю зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання выступала **прызнанне значнасці існавання дзяржаўна-прававой сістэмы**.

Гуманісты падкрэслівалі неабходнасць фарміравання станоўчых адносін да ўладных структур як вядучай умовы іх належнага функцыянавання. Ф. Скарына, сцвярджаючы першынство маральнага закону, заклікаў: *"Повинитеся убо всякому созданию человѣчию господа ради, аще царю, яко преобладающему, или князем, яко от него посланым на отмщение злодейцем, божий убо слуга ест к доброму твоему"* [1, 23]. На думку асветніка, асновай рэгулявання грамадскага жыцця з'яўляюцца трывалая ўлада і закон, здольныя забяспечыць парадак і грамадскі дабрабыт. Прызнаннем моцнай дзяржаўнасці ў асобе мудрага князя вызначаліся погляды М. Гусоўскага. Мысліцель звяртаецца да часоў кіравання князя Вітаўта як залатога веку для беларускіх зямель. *"Сілу Радзіме надаў, княства вялікім зрабіў…"*, – падкрэслівае М. Гусоўскі [2, 145]. Неабходнасць фарміравання паслухмянасці дзяржаўнай уладзе адзначаў С. Будны таму, што *"власть – вещь добрая, необходимая и полезная"*, – быў упэўнены мысліцель [6, 203]. Мудрая ўлада, паводле С. Буднага, выклікае адпаведныя адносіны ў грамадстве, а фарміраванне прыхільнасці да яе складае важную рысу зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Разам з гэтым, існаванне дзяржаўнай улады ў XVI ст. не мыслілася без трывалай прававой асновы. У "Прысвячэнні Статута Жыгімонту ІІІ" Л. Сапега падкрэсліваў вялікую ролю караля, *"найбольшего стража общей свободы"*, у захаванні дабрабыту з дапамогай права [5, 271 ]. Аднак і сам правіцель *"… никакого верховенства над нами употреблять не может, единственно столько, сколько ему право допускает"*, – падкрэсліваў мысліцель [5, 271]. Гэта абумовіла запатрабаванасць прыхільнасці дзяржаўна-прававым інстытутам у змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Прагрэсіўныя меркаванні аб верхавенстве ўлады і яе праважмернасці былі ўласцівы А. Волану. Ён быў упэўнены, што *"кіраванне дзяржавай – гэта ахвярапрынашэнне"*, так як кароль павінен з'яўляцца *"прычынай дабра ўсіх"* [7, 288]. Прававеда усклікаў : *"…Я сцвярджаю караля, а не тырана, які будзе абараняць законы і звычаі нашага народа, а не кіравацца сваімі асабістымі капрызамі, клапаціцца толькі пра сябе і прыносіць шкоду пажытку паспалітаму, народнай справе…, караля, … усе думкі якога накіраваны на дабрабыт грамадзян"* [7, 287]. Філосаф адзначаў, што *"… нічога так не дзейнічае на паслухмяных грамадзян, як станоўчы прыклад караля*", – падкрэсліваючы найвышэйшую меру адказнасці правіцеля перад сваім народам [7, 287]. Адпаведна прызнанне значнасці дзяржаўна-прававой сістэмы разглядалася як узаемаабумоўлены працэс, што грунтуецца на прававым падмурку асэнсавання асабістай і агульнадзяржаўнай адказнасці.

Побач з моцнай вярхоўнай уладай ключавое месца ў забеспячэнні дабрабыту ў грамадстве адводзілася мысліцелямі праву. Па гэтай прычыне **прыярытэт пісанага права і законапаслухмянасць** у адносінах да Радзімы-краіны з'уляліся важнымі грамадзянска-патрыятычнымі якасцямі XVI ст.

Ф. Скарына лічыў, што пісаны закон – гэта неабходнасць, якая дазволіць зрабіць грамадскія адносіны больш дасканалымі. І калі пісаны закон *"почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный подлъ прирожения подлуг обычаев земли, часу и месту, пригожий, явный, не имея в собѣ закритости не к пожитку единого человѣка, но к посполитому доброму написаный*", ён выступае "асновай сацыяльнай гармоніі, грамадскай згоды "люда паспалітага" [1, 21–22]. Захаванне законаў, на думку С. Буднага, з'яўляецца адной з галоўных дабрачыннасцей,

МГПУ им. И.П.Шамякина

якая дапамагае *“удовлетворять потребы граждан”*, не парушаючы агульных інтарэсаў [6, 201]. Менавіта такі баланс, быў упэўнены асветнік, садзейнічае справядлівым грамадскім адносінам, выступае трывалым падмуркам моцнай дзяржавы. А. Волан быў перакананы, што менавіта пісанае права з’яўляецца ахоўнікам сацыяльнага міру і грамадскай згоды, бо уім *“заложено благо государства”* [7, 292]. Законы забяспечваюць *“в государстве всеобщее спокойствие”*, а таму на іх замацаванне павінны накіраваць намаганні ўсе заклапочаныя лёсам Айчыны [7, 292]. Л. Сапега сваёй дзейнасцю прадэманстраваў прыхільнасць закону як найгалоўнейшай грамадскай каштоўнасці, прызначэнне якой тлумачыў, каб *“за недобросовестные дела свои надлежащее наказние, а порядочные пристойную плату получали”* [5, 271].

Паважлівыя адносіны да права, імкненне да яго грамадскага распаўсюджвання, перавага прававых норм у палітычных адносінах прывялі да запатрабаванасці законапаслухмянасці ў змесце выхавання патрыёта і грамадзяніна.

Ва ўмовах развіцця дзяржаўна-прававой сістэмы важнай грамадзянска-патрыятычнай якасцю з’яўлялася **добрасумленнае выкананне грамадскіх абавязкаў.** На працягу XVI ст. асэнсаванне грамадскага абавязаку адбываецца праз яго суаднясенне з правам, грамадскай працай па ўпарадкаванні і ўдасканаленні дзяржавы. І калі распаўсюджванне пісанага права мела пэўную саслоўную абмежаванасць, то выкананне сваіх непасрэдных абавязкаў згодна з саслоўнай стратыфікацыяй пазіцыянавалася як важная рыса патрыёта і грамадзяніна.

Неабходнасць ажыццяўлення прызначэння чалавека праз яго грамадскую рэалізацыю падкрэслівалася Ф. Скарынам. На думку мысліцеля сутнасць грамадскага абавязку заключаецца ў *“... добрых делах, любови к Отчизне...”* [1, 17]. На ўласным прыкладзе асветнік прадэманстраваў, як трэба *“жити во добрых обычаех, во соединеніи веры, спомогающе друг друга со всякою любовию ...”* [1, 40]. Добрасумленнае выкананне грамадскага абавязку з’яўлялася вяршыняй дабрачыннасцей, па меркаванні А. Волана. Яе увасабленнем з’яўлялася патрыятычная адданасць, калі *“...мудрым и достойным большой похвалы является тот, кто ради блага Родины, для благополучия и процветания государства без колебаний идет навстречу и сознательно подвергает себя самому большому и самому опасному риску*”, – падкрэсліваў філосаф [7, 292]. Прававед выступаў за дамініраванне законных падстаў чалавечых абавязацельстваў. Сцвярджэнне прававой асновы асобасных якасцей з’яўлялася прагрэсіўнай з’явай і абумовіла актывізацыю грамадзянска-прававога вектара зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання XVI ст.

Формай грамадскага абавязку ў А. Волана выступала катэгорыя грамадзянскага доўгу, якая грунтавалася на маральна-прававой аснове. Такое спалучэнне было абумоўлена цеснай пераемнасцю сувяззю рэлігійнай этыкі Сярэднявечча з гуманістычна-рэфармацыйнымі ідэямі ажыццяўлення грамадскага прызначэння жыцця чалавека ў XVI стст. У якасці “*свяшчэннага доўгу і ганаровага абавязаку, –* прававед вызначыў, – *руплівa і аддана захоўваць і абараняць яе (дзяржавы) дабрабыт”* [7, 287]. Менавіта па *“сумленным выкананні абавязкаў”* і захаванні правоў адрозніваў прававед сапраўдных “грамадзян” [7, 287].*“Ніякі страх перад небяспекай і ніякая надзея на ўзнагароду не павінны стрымліваць годнага і адданага агульнаму дабру сенатара ад таго, каб ён... добрасумленна выконваў свой грамадзянскі абавязак”,* – падкрэсліваў мысліцель [7, 286].

**Вывады**

Такім чынам, узбагачэнне зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XVI ст. было дэтэрмінавана рэнесансна-рэфармацыйным рухам, абумовіла прыярытэт каштоўнаснага стаўлення асобы да сваёй тэрыторыі, мовы, культуры народа. Адметнай рысай змястоўнага напаўнення грамадзянска-патрыятычнага выхавання з’явіўся прыярытэт гуманістычна-асветніцкіх перакананняў і законапаслухмянасці на аснове ідэй грамадскай згоды і “агульнага дабра”, што паўплывала на інтэнсіфікацыю асобаснай прыроды грамадзянска-патрыятычных якасцей, развіццё іх надсаслоўнага і надканфесійнага характару. Вядучай тэндэнцыяй зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання XVI стст. выступіла яго гуманізацыя за кошт уключэння нацыянальна-каштоўнасных падстаў асветы і агульнай талерантна-гуманістычнай скіраванасці.

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Скарына, Ф. Зборнік дакументаў і матэрыялаў / Ф. Скарына. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 349 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі // Старажытная беларуская літаратура : зборнік для студэнтаў / уклад. Л. С. Курбека ; аўт. прадм. У. Г. Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – С. 119–155.
3. Конан, В. М. Становление и развитие философской мысли в X–XVII вв. / В. М. Конан, А. С. Майхрович, С. А. Подокшин // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / П. Т. Петриков [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – С. 98–116.
4. Литвин, Михалон О нравах татар, литовцев и москвитян / Михалон Литвин ; перевод В. И. Матузовой ; комментарии С. В. Думина [и др.]. – М., 1994. – 245 с.
5. Сапега, Л. Посвящение Статута Сигизмунду III / Л. Сапега // История общественной и философской мысли Беларуси: Раннее и развитое Возрождение : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В. В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – С. 270–272.
6. Катэхізіс: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст. / Адаптаваны тэкст, пераклад са старажытай беларускай мовы Н. Кабелка ; рэдакцыйная калегія: Н. Кабелка (навуковы рэдактар) [і інш.]. – Мінск : Юніпак, 2005. – 312 с.
7. Волан, А. О государе и его личных добродетелях / А. Волан // История общественной и философской мысли Беларуси: Раннее и развитое Возрождение : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В. В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – С. 286–296.
8. Тяпинский, В. Предисловие к Евангелию / В. Тяпинский // История общественной и философской мысли Беларуси: Раннее и развитое Возрождение : хрестоматія : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – С. 232–239.
9. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII в.) / В. В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2001. – 200 с.

*Поступила в редакцию 26.12.16*

E-mail: marina.sherbin@mail.ru

M. M. Shcherbin

ENRICHING THE CONTENT OF CIVIL AND PATRIOTIC EDUKATION IN BELARUS UNDER THE INFLUENCE XVI c. OF RENAISSANCE-REFARMATSION NYH IDEAS

The article is devoted to tendencies of development of the content of civil and Patriotic education in the pedagogical thought of Belarus of the XVI century based on the evolution of qualitative characteristics of the individual in relation to the Home-land, homeland, the people and the homeland-the country. Shows the reforming of the content of civil and Patriotic education in the context of tolerant, humanitarian and legal values, the relationship of the content of the education of a patriot and a national-ideological and suryakantham processes of formation of the Belarusian nation. Established the importance of the Renaissance in enhancing the pedagogical thought of Belarus of the XVI century, the updating of the content of civil and Patriotic education of the progressive pedagogical ideas.

Keywords: the contents of civil-Patriotic education, the native land, Motherland-the people, the homeland-a country of civil-Patriotic qualities, patriot, citizen, Renaissance, Reformation.

МГПУ им. И.П.Шамякина